
Алесь Змагар

На правох рукапису

Алесь ЗМАГАР

С Л У Ч Ч А К И

(апавяданьне)

Велмі паважанаму
пастару Яну Пятроўскому
ад Алеся Змагара.
Працуйма для дабра
беларускага народу.
31 VII 1947 А. Змагар

Зальцбург -1947- Аўстрыя

Выданьне аўтара

ЗАЎВАГИ ДРУКУ:

1. З прычыны адсутнасьци ў машынаписе беларускае литары "і", замяняецца яна тут литарай "и" (расейскай).
2. Усё надрукована паводле пададзенага аўтарам рукапису:--строга вытрымана ўсе асаблївасьци аўтаравай мовы, правапису и сынтаксу.

ХУТАР НАД СЛУЧЧУ

Каля невялікага, зарослага густымі кустамі гаю, там, дзе гольна зелянеюць мурожныя лугі, дзе прыгожая красуня Случ нясе свае серабрыстыя, чыстыя хвалі кудысьці далёка на поўдзень, раскінуўся беларускі хутар, цудоўна і маляўніча, быццам у люстры, адбіваючыся ў празрыстых водах спакойнай рэчкі. Высокія таполі і прысадзістыя ліпы, свавольна высоўваючыся з пасаджанага роўнымі шэрагамі саду, акружалі яго магутным зялёным поясам і баранілі ад нападу сярдзітых усходніх вятроў. Выбелены дзеравяны дамок весела выглядаў з пышнай зелені вішняку і бэзу.

На прызьбе, каля парогу, ня гледзячы на раньні час, сядзела старэнькая бабулька і вязала сваю бясконцавую работу, а маленькая ўнучка, якая ніколі не адыходзілася далёка ад свае любімае бабкі, стаяла пасярод двара і, набіраючы з прыполу сваёю жменькаю залацісты ячмень, кідала яго курам і зь цікавасьцю назірала, як яны спрытна падбіралі круглыя зернятк[illegible], і тольькі адзін певень-гапагун, стоячы каля якога-небудзь ячменнага калива, ня толькі ня еў яго, але голасна падзываў да сябе сваіх падданых, каб шляхотна пачаставаць іх сваім падарункам. Прыемны пах мурожнага сена разносіўся па ўсім двары, и бадзёрая сьвежасьць раніцы, пранікаючы ў кажную шчыліну, пранізвала ўсё цела нейкай радаснай лёгкасьцю.

—Паглядзі, Марылька, што робіць Ілючок,—зьвярнулася бабулька да ўнучкі.

І задумалася.

—Каб не заснуў яшчэ,—мільганула ў

яе думках, а то зноў каровы будуць у аўсе, а бацька адшчыпле яго гэтак, што тыдзень будзе мацаць. Ен-жа яшчэ невялички, а ўжо пяць год, як ня бачыць матчынае ласки. Памерла... царства нябеснае, --и бабулька хутка змахнула рукавом набегшую няпрошаную сьлязу.

Тым часам маленькая, але досыць дасьципная ўнучка ўжо сядзела на вясковых варотах и, падстаўляючы сваю курчавую галоўку пад лёгки вэтрык, радасна ўсьмихаючыся, пазирала на выган.


Каровы, якиx яшчэ прыцямкам выгнаў Илючок на пашу, смачна зьлизвали мурожную траву. Недалёка каля их сядзеў 16-цигадовы, синявоки, з высоким русым чубам хлапчук и насьвиствываў у сьвистульку, уласнаручна зробленую им у дзяржаньни яго доўгай пуги, нейкую незнаёмую мэлёдыю.

---Бабуся! Ен каля кароў.

---Ну, добра. Бяжы да мяне.

---Илючок! ---голасна выгукнула Марылька и пачала злазиць з варот.

Илюк заўважыў маленькую сястрычку, усьмихнуўся ёй, памахаў рукою и пабег на нявысоки ўзгорак, адкуль доўга ўглядаўся то на кусты, што цягнулися за ляском аж да "Воўчае лазы"то на чарот, што часта нахиляўся да свае роднае сястры-рэчки и, здавалася, штосьци цихутка ёй шаптаў. Раптам вочки Илюка радасна заблишчэли. На рэчцы, недалёка берагу, паволи расхилиўся чачарот и, кируючы чоўном-душагубкай, паказалася прыгожая дзяўчына, уласна, дзяўчынка. Ей ледзь минула 15 год, але густыя цёмныя косы яе, чорныя блискучыя вочы, вобячая чароўная ўсьмешка даўно зьвярнули на яе ў-



ўвагу старэйшых хлапцоў,якия часта пачали заходзиць да яе бацькоў то чаго-небудзь пазычаць,то аб чым-небудзь запытацца.Але яна ни з кім гэтак не сябравала,як з суседним пастушком Илюком.Бедны-ж хлапец даўно ёю цикавиўся и цяпер,ничога никому ня кажучы,моўчки пакутваў.Усё дзяцинства яны правяли разам и не заўважыли,зь якога часу моцна папрывыкали адзин да аднаго. И вось,у апошни год на яе пачали звярочваць увагу дарослыя хлопцы.

--И чаму яны,--думаў Илюк,--вельми часта прыходзяць да яе ў хату и,пагаварыўшы крыху зь яе бацьками,заўседы зварочваюцца да ие,на што яна,цудоўна ўсьмихаючыся,што-сьци весела адказвае.И чаму им гэтак радасна?Яны ўсе гэтак голасна и шчыра сьмяюцца,у той час,кали ён,Илюк,адчувае сябе таким никчэмным,таким няшчасным,што аж сэрца яго абливаецца крывёю,а на вочы напльваюць сьлёзы.И аб чым тольки яны гавораць?И чаму им гэтак весела?

Аднак и да Илюка надыходзили шчасьливыя хвилины.Апошни тыдзень хлопцы не паказвалися,и Илюк,амаль кожны дзень у абедзенны перапынак ишоў у сад,дзе з блискучыми праменьнями ў вочках яго сустракала чорнавокая дзяўчынка.Тады яны были ўдваих,нихто им не перашкаджаў,~~яны~~ яны забывалися на ўсё.Яны адчували сябе найшчасьливейшыми ўсьвеце,у Илюка знаходзилася шмат слоў,и гутарки их кажны дзень были иншыми,кожны дзень цикавейшыми.

Дзяўчынка падплыла да берагу,прывязала човен и накиравалася на ўзгорак.
--Добры дзень!--Выгукнула яна,яшчэ

здалёк и [illegible] сваими чорными глыбокими вачыма, засьпяшалася да Илюка.

--Добры дзень, Лидачка!--Радасна сказаў Илючок и раптам, сарваўшыся зь мейсца, пабег ёй насустрач. Прывиталися. Дзяўчынка сьпяшалася.


---Скажы вашым мужчынам и суседзям, каб зараз-жа зьбиралися да нас. Прыходзь и ты. Ёсьць справа.

И пабегла.

СХОДКА

Праўда, зь мужчын, акрамя бязрукага дзядзьки Захара ды ўжо досыць пажылога Илюковага бацьки Паўлюка и некальких суседних дзядоў, никога й ня было. Усе хутаранцы ўжо больш за два тыдни, як пайшли змагацца за вызваленьне свае бацькаўшчыны. Пайшли зь ими и ўсе хлопцы, што часта прыходзили да Лидачки. Хацеў йсьци и Илюк, але яго ня ўзяли. Сказали, што трэба каму-небудзь застацца дома. Крыўдна Илюку. Кожны дзень ён бачыць, як нястрымными чародами, адзин за адным, са зброяй и бяз зброи, старыя й маладыя йшли з суседних вёсак у лясы. За сваю незалежнасьць на заклик Слуцкай Беларускай Рады паднялася ўся Случчына. Больш малодшыя пайшли ў рэгулярнае беларускае войска пад каманду палкоўника Гаўрыловича, а старэйшыя, не адыходзячы далёка ад свае гаспадарки, зарганизавалися ў невяликия вайсковыя аддзелы и на кожным кроку ставили ворагу вяликия перашкоды.

На барацьбу з паўстанцами бальшавики накиравали вяликия чорныя аддзелы и лепшыя частки свaих войскаў. Адзин з таких аддзелаў дзён пяць таму назад [illegible]няў суседнюю



вёску,и нашы хлопцы-хутарчаны,знаходзячыся недалёка ад сваих сялиб у непралазным гушчэрным бары,каб не падаць ворагу думки,што дзесьци паблизу знаходзяцца паўстанцы,не наведвалися да сваих хат.Сувязь-жа з домам падтрымоўвалася жанчынами й дзяўчатами,якия кожны дзень хадзили з кошыками па грыбы.Але ў апошния дни вораг стаў вельми нэрвавацца и забараниў хадзиць у лес.

Илюк,хутка загнаўшы кароў у загарадзь, забег да суседа,пораказаў,каб зараз-жа зьбиралися да Микалая и паймчаўся на поле да бацьки,яки пераворваў бульбу.

——Тата!Да Микалая!——Гукнуў ён яшчэ здали.——А дзе дзядзька Захар?

——На пасецы каля вульлёў.

Илюк хутка пабег на пасеку,а стары Паўлюк павярнуў з плугам да хаты.

Старыя и малыя,мужчыны и жанки——усе сыходзилися ў хату старога Микалая,и праз паўгадзины ў ёй нельга было павярнуцца.З расчыненых вакон,як з вульля,нёсься рознагалосы гул.

Стары Микалай паволи дастаў з кишэни нядаўна прынесены Лидачкаю памяты,забруджаны листок паперы и паважна перадаў яго дзядзьку Захару.

——На,чытай!Запанавала цишыня.Дзядзька Захар,уважлива разглядаючы на запэцканай паперы чорныя,алоўкам написаныя литары,голасна прачытаў:

——Кольки войска?Дзе варта?Сягоньня.

Задумалися ўсе.Нялёгка было выканаць у таки каротки тэрмин гэтакае заданьне,тым больш,што ни ў вёску ни зь вёски ня вольна было хацзиць.Маўчаньне.[illegible]ат,дзеци пакинули памиж сабою тузацца и нишкам цискулися да

сваих матак.

--Добра,дзетки,--раптам перарваў маўчанку магутны дзед Яўхим.

Усе павярнули галовы ў яго бок.

--Добра,--зноў прамовиў ён з прасьвятлелым тварам и зьлягка выцяў рукою па сваим илбу,як гэта рабилася наагул усими тыми, хто пасьля доўгих думак раптоўна знаходзиў выйсьце зь вельмитруднага становишча.

--Я бяру аброць и иду шукаць жаробку. И ня будзь я дзед Яўхим,кали ад майго вока ўсьлизьнецца хоць адзин вартавы.

--А,Божухна!А,миленьки!--Залямантавала бабка Настуля.

--Няхай цябе немач!И што гэта ты сабе надумаў?

--Маўчы,баба!--Агрызнуўся дзед Яўхим. --Не сьмяшы людзей.Ты-ж у гэтым ничога не разумееш.

--Няхай!

--Няхай идзе!

--Няхай панюхае!

--Яўхим нос добры мае.

Несьлися з усих бакоў галасы.

--Праўда!Праўда!--Дадаў дзед Пилип и закиваў сваёю лысаю,хоць боб малаци,галавою,--Заўсёды ён нас ратоўваў.

И ўспаминаючы былое,пачаў апавядаць.

Даўно было...Били шчэ дзяцюками.Надумалися ў пански сад залезьци,у сапяжанки. Агледзяли падгниўшы кол у плоце,зрабили дзирку и ў час абедзенны заскочыли ў сад. Усё так циха,добра,видаць,абедаюць паны. Залезьли на сапяжанку,а йгруш,ну,што пяску.Усе жаўцюсеньки.Ямо и за пазуху кладом. Аж чуем:затрашчаў сучок.

--Уцякайма!--Выгукнуў Сидор Прыщихли.

Слухаем...Цишыня.Ни шолаху--хоць муха праляци.

--Э-эт!--Прамурматаў Микита,--прычулася яму.

И мы зноў забылися на ўсё.Ажно,адкуль и чорт прынёс--як тут,стаиць аконам.

--Зьлязайце,абибоки!

Перапалохаў усих.Микита,дык аж зь дзерава зьляцеў.

--Вось вам пакажа пан!--Пужае аканом и ўсих вядзе ў пакои.Прывёў.Стаим.Мяркуем,каб блишэй да парогу.Яўхим-жа,--хоць-бы што. Зирнуў на пана,на паненку,усьмихнуўся... Э-эх,маладзец!И адпалиў-жа байку.Пра Ивана,што ў пана бароны пазычаў.Ну й рогату-ж было.И ўсих пусьцили нас.Нават,сапяжанак йшчэ дали.

И дзяды павесялели,успаминаючы свае маладыя гады,кали далёка на ўсю ваколицу неслася слава аб их спрытных учынках.

--Пара,--прагаварыў дзед Яўхим и ўзьняўся з услона.--Хто са мною?

--Я,дзядусь,--выгукнуў Алесь,нявысоки суседни хлапчук,яки,ня гледзячы на свае 15 год,быў досыць спрытны,сьмелы и па даросламу разважливы.

--Ты,Алесь,--працягваў дзед Яўхим,--пойдзем у вёску.Даведайся,што там за войска?Дый асьцярожны будзь.Глядзи ў абодвы. Каб не папаўся.Кали-ж,ня дай Бог,што--кажы:да цётки йшоў.Пазычыць нитки.

--Добра,дзядусь!Праз 2 гадзины чакай назад,--прамовиў Алесь и разам зь дзедам выйшаў з хаты.

--Шчасьлива!Хутчэй вярнуцца!--Неслася им наўздагон.

У РАЗВЕДЦЫ

Алесь и дзед Яўхим разышлися ў розныя бакі.

--Кось-кось-кось-кось!--Пачуўся каля чароту голас дзеда Яўхима.--Кось-кось...

--Стой!Кто йдзе?

--Хиба-ж ня бачыш?Гэта-ж я...дзед Яўхим.Ци нл бачыў тут мае жарэбки?Чорная,зь невялiкаю лысинкаю на илбу.Як пабегла з поля,дык ужо больш за гадзину шукаю.Як у воду канула,хаця-б ня трапила у "Воўчую лазу".

--Дык чаго-ж ты ходзиш каля рэчки?Тут вайсковая варта.Цывильным хадзиць тут забаронена.Ды й здалёк видно,што ниякиx тут жаробак няма.

--Тут-та няма.Але адсюль и паглядзець добра.Куды ни гляне,усё,як на далони.Можа адсюль и жаробку ўбачу,--паволи адказаў дзед Яўхим и пачаў прыглядацца па ўсе бакi.

--Идзи!Идзи хутчэй!А то заарыштую,--ужо злосна загаварыў вартавы.

--Табе жарты,а ў мяне жаробка прапала,-агрызнуўся дзед Яўхим и накираваўся да кустоў,што кучкаю тырчэли каля самае канавы,якая цягнулася аж у "Воўчую лазу".

--Кось-кось-кось...

--Назад!--перарваў вартавы.

Дзед паволи павярнуў да хутара и,голасна гукаючы сваё "кось-кось-кось",пайшоў на выган,дзе,ляскаючы сваёю пугаю,бегаў каля кароў Илючок.Хитрая ўсьмешка блукала па дзедавым твару.

--2 каля мосту,2 каля броду,2 каля дзяковага агароду.1 каля рэчки блиэу канавы.Добра.Шкода,што канавы зярод кустоў не агледзяў.Ня пусьцiў.Напэўна,кулямёт стаиць.Баяцца "Воўчай"як чорт ладана.Э-эх!Хоб-жа Алесю



Кось-кось-кось...

хоць пашанцавала.

xₓx

Тым часам Алесь падышоў кустами да "Высокага берагу"и пачаў пильна ўглядацца на други бок рэчки.Ціха калыхалися хвали, нибы дражнилися зь вясёлыми сонечными праменьнями.Ветрык сьцих,и ўсё зьнямела.Тольки зь вёски гулка даносиўся грук сякеры и виск пилы.Алесь,не сьпяшаючыся,адвязаў дзядзькаў човен и пераплыў на други бок рэчки. Дзе кустами,а дзе канавою,прыслухоўваючыся да кожнага шолаху,паволи рухаўся Алесь да вясковых агародаў.Вось ўжо дзяковы хлеў,далей---Амелькава хата,а там и цётка.

---Стой!Куды йдзеш?--Данеслася з-за плоту дзяковага агароду.

---Я да цётки...

---Тав. Малышкин!Завядзи яго ў карцар. Заўтра камисар будзе дапытваць иншых,а заадно разьбярэцца и зь им.

---Правалиў справу,--падумаў Алесь.-- Што рабиць?Сягоньня чакаюць.

И раптам зьвярнуўся да Малышкина.

---Мне патрэбна зараз-жа бачыць начальника

---Што-о?Навошта ён табе?--Зьдзивиўся Малышкин,тым больш,што нихто з затрыманых ня тольки ниразу ня выказаў жаданьня бачыцца з начальникам,а хутчэй за ўсё жадаў-бы зь им наагул ня бачыцца.

---Маю справу.Мне трэба зараз-жа яго бачыць.

---Можа што й важнае скажа,--прагаварыў Малышкин.

Пашли.Праз хвилин 5 паказаўся будынак валасной управы,з падстрэшша якога [illegible]

матлялася чырвонае палотнишча, а каля дзьвярэй стаяў вартавы. Не стукаючы ў дзьверы, Малышкин шырока расчыниў их и, трымаючы Алеся за руку, пераступиў парог.

—Таварыш камбат! Прывеў да вас хлапчука. Мае штосьци сказаць.

И пайшоў.

Алесь павёў вачыма па пакою. За сталом перад разгорнутаю картаю низка схилилася 6 галоў.

—Цэлы штаб, —падумаў Алесь и азирнуўся на дзьверы. За сталом заварушылися.

—Ну, што добрага скажаш, —данёсься няпрыемны хрып, узьнялася ўскудлачаная галава, и на Алеся ўставиўся тупы позирк мутных, асалавелых вачэй.

—Пэўна, камбат, —падумаў Алесь и хутка адказаў:

—Прышоў паступиць дабраахвотникам у вайсковую школу.

—Ого! —Зьдзивиўся камбат. —А кольки табе год?

—Пятнаццаць, —жвава прагаварыў хлапчук.

—Адкуль ты?

—З хутара. З-за рэчки.

—Добра... А што ты чуў пра бандытаў? (Гэтак бальшавики называли слуцких паўстанцаў).

—Сам ты бандыт, —запалиўся Алесь, але спакойна адказаў.

—У нас их няма.

Камбат маўчаў.

Алесю станавилася не па сабе. Нейкае незнаёмае пачуцьцё жаху пачынала ахопливаць яго. Яму здавалася, што хтосьци добра знаёмы ўвесь час праниклива ўзираецца ў яго, стараецца улезьци ў душу, прачытаць самыя патаем-

ныя думки.Алесь пачаў нэрвавацца.Перaступаючы з нагi на нагу,ён азiрнуўся ў кут.

--Буй!Гэта-ж Хведагаў сын,Алешка,--прарэзаў паветра гнусавы голас.

--Гэцаль Браншгэйн,--мiльганула ў Алеся думка.

Сын слуцкага крамнiка Хаiма,Гэцаль яшчэ з 1917 г.паступiў у бальшавiцкую партыю i зараз быў камiсарам.Апрануты ў кожанку,з наганам за поясам,ён сядзеў у куце i злосна паблiскваў сваiмi чорнымi,лупатымi вачыма.

--Алешка,ты хлусiш,--злаваў ён,--кажы лепш праўду.

Усё ён ведае,--падумаў Алесь,аднак,гледзячы проста ў вочы камiсару,хутка адказаў:

--Тыдняў два таму назад праходзiла некальнi чалавек.Але яны вышлi з "Гнилой" i пашлi ў "Вялiкi Бор"а ў "Воўчай лязе"нiкога няма.Там нi прайсьцi,нi пралезьцi.Толькi ваўкi шнырацъ.

Алесь замоўк.Маўчалi ўсе.Глыбокiя складкi прарэзалi твар камбата.Ён задумаўся.

--Апошнi тыдзень паўстанцы нiчым сябе ня выказвалi,i карны аддзел,замiж выкананьня свайго баявога заданьня,--пошукаў i зьнiшчэньня партызанаў,--займаўся пошукамi i рэквiзыцыяй сялянскай маёмасьцi.Салдаты напiвалiся самагону,буянiлi.Iх баявы настрой пераходзiў у настрой рабаўнiцтва i марадзёрства. Таму камандзiр батальёну i склiкаў да сябе сваiх блiжэйшых спаборнiкаў,каб зь iмi параiцца i,магчлiва,пераехаць у суседнюю воласьць,дзе партызаны ня толькi ўначы,але й сярод белага дня свавольна разьяжджалi па вёсках,наладжвалi вечарынкi,сьпявалi песьнi.Нават,цяпер у яго вушах зьвiнелi грозныя гукi ваяцкага

маршу слуцкіх паўстанцаў:

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
На вольны,родны свой прастор.
Хай воля вечна будзе з намі,
А гвалту мы дамо адпор.

Грымела песьня.Магутнай хваляй неслася ў прастор,заклікала ўзьняцца за волю,за незалежнасьць.И выходзілі ўсе,хто толькі мог у руках трымаць зброю.И далучаліся да паўстанцаў.

Камандзір карнага аддзелу ўсё гэта ведаў,але зрабіць нічога ня мог и толькі злаваў.

--Што за чорт,--голасна прамовіў ён,--што за разьведка?Баяцца куста,як авечкі воўка.Убачаць пень,и рапарт гатовы:вораг залёг там и там.

--Пужаная авечка и куста баіцца,--успомнілася Алесю дзедава прыказка.

Камандзір паглядаў на Алеся.Глядзеў ён доўгім пранікліввым позіркам.Алесь маўчаў.Неадчэпная думка "хутчэй да сваіх"пачала сьвярдліць у галаве,нібы раскалённае жалеза.Але ў ім яшчэ шмат было дзяцінага.Закіпелі фантастычныя жаданьні помсты.

--Эх,кінуць-бы ў гэтыя,тлустыя ад чужых харчоў,морды гранату.Пакуль перапалох,дык и зьнікнеш.А там--шукай ветру ў полі.

Камбат штосьці хацеў сказаць яшчэ,але адчыніліся дзьверы,и пасыльны перадаў яму пакет.

--Ну,малы,--прамовіў камбат,--прыходзь да мяне заўтра.Сягоньня няма часу.

--Нарэшце,--узрадаваўся Алесь и хутка вышаў за дзьверы.

Абапёршыся на стрэльбу,вартавы сонна зірнуў на Алеся и ўронуўся ў свае глыбо-

кия думкі:жонка,дзеці,родная хата---усё гэта засталося далёка,далёка,аж за Масквою. Хутчэй-бы канец вайне.Хутчэй-бы да хаты...

ДАРУЧЭНЬНЕ

Алесь хутка закрочыў грэбляю и за вясковай кузьняю павярнуў на "Пратву",дзе бабы паласкали бялизну.Некальки хлапчукоў бегали па беразе,пераскаквали кусты,кулялися,видаць,грэлися пасьля сьцюдзёнай вады. Убачыўшы Алеся,яны гуртам падбегли да яго.

---Давай,падужаемся!---Выгукнуў большы зь их,Зьмитручок.

---Давай!

Хлопцы схапилися и пачали качацца па траве. Нарэшце,Алесь апынуўся наверсе.Зьмитручок зрабиў некальки дарэмных рухаў,але Алесь моцна сядзеў на им.

---Мир!---Папрасиўся Зьмитручок.

---Мир,---згадзиўся Алесь.

Яны ўзьнялися зь зямли и пациснули адзин аднаму руки.

Раптам на цьвинтары каркнула варона, а за ёй з прарэзьливым крыкам узьнялася цэлая хмара их,каб праз кольки хвилин зноў апусьцицца на дрэвы.Алесь зьдзиўлена азирнуўся

---Гэта бальшавицкая варта,---прагаварыў Зьмитручок.И ўдзень и ўначы яны там стаяць.Пэўна,зьмена прышла.

---А ци стаяць на той бок вёски?---запытаўся Алесь.

---Там стаяць 1.За хлевам Михалевича.

---Давайце ў хованку,---зэпрапанаваў маленьки Янучок.

Пачалася гульня.

Хвилина и Алесь зьникае ў ситнику.

Абминуўшы "Папову яму",адно з найглыбшых мейсц Случы,спрытна хаваючыся пamiж высокiм берагам и чаротам,часта западаючы вышэй кален у гразь,ён сьпяшаўся да хаты.

Илюк,яки ўжо даўно чакаў свайго сябра и круциўся пасярод рэчки на чоўни,моцна ўзрадаваўся,кали ўбачыў вылезшага з чароту, усяго-забруджанага Алеся.

--Як справы?

--Эх,браця Илюк!Каб нам 10 сьмяльчакоў.Як спрытна можна было-б уначы прасьлизнуць на чайцы праз чарот,аж каля самага носу вартавых,да "Паповай ямы",а там папаўзьци да агародаў и...зараз-жа воласьць. Зьнищчыць усё начальства.Асалдаты?...Яны сами кинуць винтоўки.И вайне канец.

--Прышлюць других.

--И з другими гэтак сама.

Неўзабаве яны апынулися ў хаце.Дзед Яўхим вярнуўся ўжо даўно и сядзеў зь Микаем и дзядзькам Захарам за сталом.Захар штосьци писаў.На ўслоне каля печы моўчкi сядзела Лидачка.

--У вёсцы цэлы батальён,--не чакаючы пытаньняў,хутка Прагаварыў Алесь.Быў у штабе.Камандзир батальёну,кудлаты,з чырвоными вачыма хрыпун.Камисар,Гэцаль Каимаў,у чорнай кожанцы,з наганам,и яшчэ нейкия 4.

--Дзе вартавыя?

--Каля плоту ў дзяковым агародзе 2, каля рэчки супроць хутара 2,каля воласьци 1,за хлевам Михалевича 1 и некальки чалавек на цьвинтары.

Захар записаў.

Алесю хацелася апавясьци аб сваих здарэньнях,але дзед Яўхим перарваў яго:

--Хто возьмецца перадаць гэты лист нашым хлопцам?--Павaжна запытаўся дзед



Яўхим, бяручы ад Захара паперу.

Ёлиск чорных вачэй мильгануў ад печы и затрымаўся на Илюку.

--Я!--Усхвалёвана выгукнуў Илюк.

--Я!--Цьвёрда сказаў Алесь.

--Я!--Радасна прамовила Лидачка.

Дзед Яўхим крыху падумаў и перадаў лист Илюку.

--На!Пападзешся,--праглыни.Скажаш,--цялё жукаў.Патрымаюць и пусьцяць.Ня раз бачыли цябе каля кароў.Зловяць Лиду--зьдзекавацца будуць.Кали-ж, ня дай Бог,давялося-б трапицца ў их руки Алесю,дык личы прапала. Ничым ня выратуеш.А ты,--зноў зьвярнуўся дзед Яўхим да Илюка,--пойдзеш адвячоркам, кали будуць гнаць з пашы быдла.

РАНЕНЫ

Илюк,яки,здавалася,нияк ня мог дачакацца заходу сонца,то нэрвова,ляскаючы пугаю,бегаў каля рэчки,то,сеўшы на сустромны бераг,падпираў далонями падбародак и доўга глядзеў на серабрыстыя хвали,над якими моўчки кружыў свае чорныя ґалоўки цёмназялёны чарот,ды кали-ни-кали,агалошваючы сваим праразьливым крыкам усю ваколицу,пралятала книгаўка.

--Хутчэй-бы!Хутчэй-бы адвячорак.Нарэшце я змагу даказаць,што я варты Лидачки.

Сонца паволи хавалася за далёки хваёвы лес,верхавины якога яскрава чарнели ў агнистым полымя закату.Моцна сьциснуўшы ў руцэ зьверчаны ў маленькую трубачку лист, памахваючы сваёю неразлучнаю пугаю,Илюк накираваўся да "Воўчай лазы".

Ужо абминуў ён першую варту,ужо падышоў да канавы а там...высоки купник,хава-

ючыся ў якім ён зможа дабрацца да сваих.

---Стой!---Пачуўся грозны воклич.

Дзьве стрэльбы злосна пазирали з гальля сваими чорными вачыма.

---Усё прапала,---пранеслася ў Илюка думка.

Чорная постаць аддзялилася ад куста и паволи наближалася да хлапчука.Думки адна за аднэй мильгали ў яго галаве.Раптам руки яго маланкава замитусилися каля пугаўя и твар прасьвятлеў.

---Ци ня бачыли цяля?---ледзь ня плачучы, запытаўся Илюк.

---И чаго яны швэндаюцца сягоньня?---больш лагодна прагаварыў вартавы,пазнаўшы пастушка.

Аднак Илюка затрымаў.

--Накиравацъ у калавурку,--запрапанаваў други.

Але заставацца аднаму ўначы па суседству з "Воўчай лазою"нихто зь их не хацеў,и, крыху пашаптаўшыся памиж сабою,яны загадали Илюку разьдзецца.Иад холаду и ад страху хлапец дрыжэў,як асинавы лист.Тым часам вартавыя пачали аглядаць вопратку.Ни адзин рубчык,ни адна складка не засталися бяз увагм,але ничога не знайшоўшы,вартавыя зьвярнули вопратку назад

---Йдзи дадому!

Узрадаваны Илюк праз хвилину ўжо быў апрануты и хутка зьник у адвячорным змроку. Крыху адышоўшыся ад варты,Илюк зноў павярнуў да "Воўчай лазы"и зараз-жа натрапиў на вузкую,нават,удзень ледзь бачную сьцежку, якую ведаў тольки ён ды яго самы близки сябра Алесь.Лёгка пераскакваючы з купины на купину,пераляваючы праз павалены́я бурам дрэвы,циха,быццам кошка,крэўся памиж кус-

тами Илюк. Зълева и справа грозна наближалися цёмныя здани-кусты. Сэрца моцна калацилася.

—Хоць-бы йзноў ня трапиць да вартавых, —думаў Илюк, и кроў застывала ў жылах. Раптам наплыў вобраз Лидачки, и на душы стала цёпла, радасна. Илюк циха ўсьмихнуўся:

—Эх, и мужчына я... А яшчэ хачу быць вартым Лидачки. Пападуся? Ну и што-ж? Справа перш за ўсё. А кали й загину, дык за волю, за родны край. И Илюк шпарка запрочыў наперад.

—Стой! —Недзе ля перад самым носам захрыпела з правага боку з куста, и хтосьци заварушыўся.

—Канец, —прастагнаў хлапчук, але, инстынктыўна ратуючы сябе, ён раптам скочыў у працилеглы бок и паймчаўся, кольки меў силы.

—Ба-ах! —Праразьлива грукнула ў вушох, и вострая боль пранизала левае плячо. У вачох пацямнела. Напружваючы апошния силы, Илюк бег и бег наперад. Але больш ён ужо ничога ня помниў. Раптам у вачох пацямнела, и цела мякка апусьцилася на купину.

СЯРОД "ПАЎСТАНЦАЎ"

Кали Илюк расплюшчыў вочы, левае плячо яго моцна шчымела, а над им схилилася каля пятнаццаци спачуваючых твараў. Фэльчар рабиў перавязку и моцна прыцискаючы рану, накладаў бинт. Сярод густых кустоў гарэў невялики касьцёр, яки распаўсюджваў прыемную цяплыню.

—А дзе пуга? Пуга дзе? —Спалохана запытаўся Илюк.

Яму паднесьли пугу.

—Тут... у пугаўк...! —зашаптаў Илюк и абязсилены заплюшчыў вочы.

Усе зьдзиўлена пераглянулися.

--Мо з гарачки?--Ціха перагаварыў адзін.

--Бедны хлопец!--Спачуваў другі.

Высокі з русаю барадою паўстанец нізка схіліўся над белым тварам Ілюка.

--Падай пугу!--Загадаў камандзір паўстанцаў и стаў уважліва разглядаць пугаўё. Але нічога нельга было заўважыць.


--Звычайная пуга пастуха,--прагаварыў ён и хацеў палажыць яе каля Ілюка,як раптам позірк яго затрымаўся на на дзяржаньні,у самым канцы якога ледзь прыкметна чарнела маленькая дзірачка сьвістулькі,мастацкі зробленая Ілюком и запэцканая зямлёю ў той момэнт,калі яго запыняла першая варта.Кончыкам кішанёвага ножыка камандзір асьцярожна выкалупіў зусім пакамечаны,маленькі скрутак паперы,разгарнуў яго,паволі разгладзіў и ніжэй прыгнуўся да агню.Дробныя,але яскрава выведзеныя дзядзькам Захарам літары адразу кінуліся ў вочы камандзіру и запалілі ў іх нешта цьвёрдае,рашучае.Ён моўчкі выцягнуў з кішэні капшук з тытунём,скруціў цыгарку и глыбока зацягнуўся.У галаве яго адна за аднэй набягалі ўсё новыя и новыя думкі.

--Кастусь!--Гукнуў ён зьвязнога.--Зараз-жа паведамі ўсіх сабрацца сюды.Сёньня будзе справа.

Зьвязны зьнік у цемры.Астальныя паўстанцы,стоячы каля Ілюка,спагадліва глядзелі,як спрытныя пальцы фэльчара старанна забінтоўвалі раненае плячо.Камандзір глянуў у іх бок.

--Харошы хлопец,--падумаў ён,--такі малады,а ўжо ахвяруе сабой.Змагар.

Тым часам фэльчар кончыў перавязваць рану,яшчэ раз пашчупаў пульс и голасна пра-



мовиў:

--Будзе жыць.Сур'ёзных пашкоджаньняў няма.Страта крыви.Патрэбны добры догляд.

Як-бы ў адказ яму,Илюк зноў зашавялиў вуснами,уздыхнуў,расплюшчыў вочы и ледзь чутна прашаптаў.

--Чаротам...да "Паповай ямы"...агарод... воласьць...--и зноў закрыў вочы.

Але ўсё зразумеў камандзир.Бацькаўскаю цяплынёю забліщчэли яго вочы.И доўга глядзеў ён кудысьци ўдалячыню.У яго ваччу паўстала постаць сына,такога самага хлапчука,як Илюк, заарыштаванага и вывезенага бальшавиками кудысьци на поўнач.А за што?Ци быў які басяк?Ци злодзей?Вучыўся ў народнай школе.Стараўся.Настаўник раиў вучыць далей.Аддаў у гимназию.И там хвалили.

Прывозиў пяцёрки.

Ужо вершы пачаў писаць.И якия прыгожыя!

И ўсё аб краю.Аб Бацькаўшчыне.И раптам уначы схапили и...няма.

Думки перарвалися паўстанцами,якия,аддзел за аддзелам,падыходзили да яго.

Пачалася нарада.

ИЛЮКОВАЯ РАДАСЬЦЬ

Чорныя,прадаўгавата-круглыя галоўки чароту захисталися,рассунулися асьцярожна, рассунулися руками.Бясшумна вынырнули 2 цёмныя постаци и,трымаючы штосьци прадаўгаватае ў сваих моцных руках,циха накиравалися да раскидзистай,быццам усими забытай,липы. яе шырокая,круглая шапка,грозна чарнеючы сярод шэрага зироку ночы,магутна насоўвалася аж да вакон недалёка пабудаванай хаты,зь якіх,праз няшчыльную посьцилку,ледзь-ледзь

прабивалися тонкия палоски сьвятла.


Спыниўшыся каля ліпы,яны асьцярожна палажылі сваю ношу.Шырокаплечы,сярэдняга росту мужчына,прыгінаючыся ніжэй плоту,хутка накіраваўся да хаты.Другі,не сьпяшаючыся падняўся ад насілак,выпрастаў свае магутныя плечы,усімі грудзямі пацягнуў паветра і асьцярожна прытуліўся да дрэва.Рухаўся ён паволі,быццам разьлічваў на найменшую страту энэргіі,але яго магутныя,шырокія плечы,моцныя мускульныя рукі,мазолістыя цьвёрдыя далоні яскрава сьведчылі,якой вялікай небясьпецы наражаўся той,хто меў няшчасьце трапіць у іх,як вораг.

Праз дзьве хвіліны каля насілак ужо клапаціліся стары Мікалай,дзед Яўхім і бацька Ілюка,якія пасьля сходкі так і не пашлі дамоў,а,седзячы за сталом,слухалі гістарычныя апавяданьні,на якія дзядзька Захар быў вялікі мастак.І грозная велич слаўнай мінуўшчыны Беларускага народу выразна паўставала перад вачыма случчакоў.

Ілюка палажылі ў новай хаце на мякка пасланую пасьцель.Белы твар хлопца спакойна вырысоўваўся сярод пасьцельнай бялізны, і толькі лёгкае,ледзь прыкметнае дрыжэньне век сьведчыла,што малады арганізм яшчэ жыве і вядзе жорсткую барацьбу за сваё існаваньне.

Партызаны аддалі чэсьць.
—Жыве Б е л а р у с ь!
—Жыве Б е л а р у с ь!
—Жыве Б е л а р у с ь!
І зьніклі ў цемры.

Ціхая ноч агарнула зямлю.Лёгкі ветрык, ледзь калыхнуўшы галінку ліпы,заблытаўся ў



яе трапятких листочках и зусим зьник.

Усё замёрла.

Ни грукату, ни шолаху, быццам перад навальницай. Раптам, сярод цишыни ночы глуха прагучэла сем стрэлаў, и хутка ажыла вёска. Сьпяшаючы выкинуць свае сьмертаносныя кули из стальнога горла, вар'яцки забухали стрэльбы. Памагаючы им, злосна захлёбвалися два цяжкия кулямёты.

Быццам скрозь сон чуе Илюк грукат ружэйных стрэлаў, страшэнную кулямётную траскатню, магутнае "Урра!", "За волю!", "Ура!"

Ён ведае: гэта паўстанцы. Яму хочацца зараз-жа ўсхапицца й бегчы, бегчы туды, дзе адважныя паўстанцы сьмела ўступили ў змаганьне за незалежнасьць свайго краю. Але нешта пякучае моцна ўчапилася яму ў плячо и ня пускае. Ён прыслухоўваецца. Страляніна паволи зацихае.

--Чый верх? Хто перамог?

Магутнае "Урра!" скаланула ўсю ваколицу и баявыя гуки ваяцкага маршу слуцких паўстанцаў апавясьцили мир аб новай перамозе.

З усих сил намагаецца Илюк расплюшчыць вочы. Зь яго грудзей вырываецца балючы стогн. Чутны лёгкия кроки.

Яму здаецца, што над им хтосьци низка нахилиўся, и пухныя гарачыя вусны зьлёгку дакранулися да запёкшыхся ад смаги яго вуснаў и зьлилися ў гарачы доўги пацалунак. Балюча-салодкая ўтома разьлилася па ўсяму яго целу. Намагаючыся з апошних сил, ён яшчэ раз голасна застагнаў и прачнуўся. У расчыненую фортачку [illegible] гуки цудоўнай мэлёдыи:

"У крывавых муках мы народзім
Зыцьцё Рэспублікі свае́й!
Нізка схіліўшыся над ім, пяшчотна блішчэлі чорныя бяздонныя вочы Лідачкі.

